Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.
№ 57 (126)
НЯДЗЕЛЯ
10
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 8 сакавіка на фронце не адбылося нічога істотнага. У Выбаргскім заліве нашы часці занялі востраў ЕСІ-СААРЫ з мястэчкам ЕСІ-СААРЫ, востраў КАЦІЛАН-СААРЫ з мястэчкам РАХКАСААРЫ, востраў ПЕРВА-СААРЫ, востраў МУСТА-СААРЫ, востраў з мястэчкам ХІЕТАСААРЫ.

Нашымі часцямі захвачана 12 гармат, 57 кулямётаў, 2 мільёны патронаў.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках праціўніка, пры гэтым збіта два самалёты праціўніка.

АБ МІЖНАРОДНЫМ КОМУНІСТЫЧНЫМ ЖАНОЧЫМ ДНІ 8-га САКАВІКА

Пастанова ЦК ВКП(б)

Міжнародны комуністычны жаночы дзень працоўныя нашай краіны святкуюць у 1940 годзе ў абстаноўцы новых перамог соцыялізма ў СССР, ва ўмовах велізарнага ўздыму палітычнай і вытворчай актыўнасці працоўных, далейшага ўмацавання маральна-палітычнага адзінства совецкага народа і яго згуртаванасці вакол большэвіцкай партыі.

Адным з выдатных вынікаў соцыялістычнага развіцця СССР з'яўляецца рост актыўнасці совецкіх жанчын ва ўсёй справе комуністычнага будаўніцтва.

З кожным годам расце роля жанчыны ў прамысловасці, у калгасах і соўгасах, ва ўстановах, на фронце культуры і навукі. За годы сталінскіх пяцігодак колькасць жанчын-работніц і служачых павялічылася больш чым у 3 разы, з 3 мільёнаў у 1929 годзе да 10,7 мільёна ў 1939 годзе, што складае 37,4 процанта ўсяго састава рабочых і служачых СССР.

Совецкія жанчыны паспяхова авалодваюць самымі складанымі прафесіямі і спецыяльнасцямі, раней даступнымі толькі мужчынам. На чыгуначным транспарце жанчыны працуюць машыністамі, у металургіі—сталяварамі, у вугальнай прамысловасці — машыністамі ўрубавых машын і т. д. Удзельная вага жанчын у буйнай прамысловасці Совецкага Саюза дасягнула 41,6 процанта.

Жанчыны-калгасніцы паспяхова авалодваюць прафесіямі камбайнераў, трактарыстаў, механікаў, шофераў. Сярод механізатарскіх кадраў у МТС у 1939 годзе працавала 60 тысяч жанчын. На курсах і ў школах трактарыстаў, камбайнераў і шофераў навучаецца больш 100 тысяч жанчын-калгасніц.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка асабліва наглядна паказала ролю жанчыны ў сельскай гаспадарцы. З 2.892 удзельнікаў выстаўкі, узнагароджаных Галоўным Камітэтам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі вялікімі і малымі залатымі медалямі,—765 жанчын.

З кожным годам расце колькасць жанчын — інжынераў і тэхнікаў, навуковых работнікаў.

Дзесяткі тысяч совецкіх жанчын паспяхова працуюць на кіруючых пастах ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Сотні тысяч жанчын выбраны ў кіруючыя органы дзяржаўнай улады СССР. 1625 жанчын з'яўляюцца дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўных Советаў саюзных і аўтаномных рэспублік, больш 420 тысяч — дэпутатамі мясцовых Советаў.

Ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва жанчыны прадстаўляюць велізарную сілу, сваімі гераічнымі справамі праслаўляючы нашу Радзіму, умацоўваючы магутнасць соцыялістычнай дзяржавы.

Шырокі ўдзел прымаюць совецкія жанчыны ў соцыялістычным спаборніцтве імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі за выкананне ў чатыры годы задання пяцігадовага плана па росту прадукцыйнасці працы. З к о ж н ы м д н ё м растуць рады жанчын стаханавак, многастаночніц. Усё шырэй становіцца круг перадавых совецкіх жанчын, узнагароджаных вышэйшымі адзнакамі ў нашай краіне—ордэнамі Саюза ССР.

Совецкія жанчыны паказваюць узоры самаадданасці ва ўмацаванні абароны СССР і гераічнай ахове сваёй Радзімы. Ужо нямала жанчын, узнагароджаных ордэнамі і медалямі Саюза ССР за ўзорнае выкананне баявых заданняў і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць.

Совецкі лад выхаваў новы тып жанчыны, якая паказвае ўзор комуністычнай свядомасці, беззаветна аддана сваёй Радзіме і вялікай справе комунізма.

Шырокі ўдзел жанчын у вытворчым і грамадска-палітычным жыцці краіны магчымы толькі ў краіне соцыялізма, дзе створаны для гэтага ўсе неабходныя ўмовы. Толькі ў СССР жанчыне створаны ўсе ўмовы для забяспечанага і шчаслівага мацярынства. Ні адна краіна ў свеце не мае такой прадуманай, разнастайнай сістэмы ўстаноў, якія дапамагаюць мацеры выхоўваць здаровых дзяцей: дамы адпачынку для цяжарных, дзіцячыя кансультацыі, яслі, малочныя кухні, дзетсады, дзіцячыя санаторыі, піянерлагеры. За апошнія тры годы дзяржава адпусціла на дапамогу многадзетным мацерам звыш 3 мільярдаў рублёў.

ЦК ВКП(б) абавязвае партыйныя арганізацыі правесці Міжнародны комуністычны жаночы дзень — 8 сакавіка, як масавую палітычную кампанію, паказаўшы сусветна-гістарычнае значэнне вызвалення працоўных СССР ад капіталістычнага рабства, глыбокую розніцу паміж свабодным, поўнапраўным становішчам совецкай жанчыны, актыўнай будаўніцы комуністычнага грамадства, і прыгнечаным становішчам жанчын у капіталістычных краінах.

Партыйныя, профсаюзныя і комсамольскія арганізацыі павінны дабіцца яшчэ большага ўцягнення жанчын у прамысловасць і транспарт, далейшага павышэння ролі жанчыны ў соцыялістычнай сельскай гаспадарцы, узначаліць рух совецкіх жанчын за авалоданне складанымі прафесіямі ў прамысловасці, транспарце і сельскай гаспадарцы, абароннымі і медыцынскімі спецыяльнасцямі.

Неабходна ўзмацніць работу па вылучэнню перадавых жанчын і дзяўчат на кіруючыя пасты і пасады ў совецкіх, гаспадарчых і грамадскіх арганізацыях, уцягваючы лепшых беспартыйных жанчын, якія на справе даказалі сваю адданасць Радзіме і справе будаўніцтва комунізма, у рады большэвіцкай партыі.

ЦК ВКП(б) указвае, што велізарны рост жаночай працы ў народнай гаспадарцы СССР патрабуе далейшага паляпшэння якасці работы дзіцячых і лячэбных устаноў, радзільных дамоў, прадпрыемстваў грамадскага харчавання, пральняў і т. д. Неабходна шырока прыцягваць да гэтай работы і да кантролю за выкананнем пастаноў партыі і ўрада па паляпшэнню вытворчых і бытавых умоў жанчын, саміх працоўных жанчын і, у першую чаргу, жанчын-дэпутатаў Советаў і шматлікі жаночы актыў грамадскіх арганізацый.

Памятаючы, што выхаванне дзяцей, нашага будачага пакалення, з'яўляецца адной з важнейшых задач жанчыны, партыйныя, совецкія, профсаюзныя і іншыя грамадскія арганізацыі павінны узмацніць клопаты аб жанчыне мацеры, стварыць усе неабходныя ўмовы для таго, каб жанчыны-мацеры, сумесна са школай і комсамолам, прынялі яшчэ больш актыўны ўдзел у комуністычным выхаванні дзяцей.

Партыйныя арганізацыі павінны ўсямерна садзейнічаць далейшаму павышэнню ідэйна-палітычнага ўзроўню жанчын, росту іх комуністычнай свядомасці, палітычнай і вытворчай актыўнасці ў барацьбе за выкананне Трэцяй Сталінскай пяцігодкі, за далейшыя перамогі комунізма.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б).

ВЕРНАМУ САРАТНІКУ ЛЕНІНА І СТАЛІНА, ГЛАВЕ СОВЕЦКАГА ЎРАДА

Вячэславу Міхайлавічу Молатаву

У дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя Совет Народных Камісараў Саюза ССР шле Вам большэвіцкае прывітанне і гарачыя пажаданні добрага здароўя і сіл на многія і многія годы.

У Вашай асобе Совет Народных Камісараў Саюза ССР вітае вернага саратніка Леніна і Сталіна, дзеяча ленінска-сталінскага тыпу, які спалучае ў сабе большэвіцкую непрымірымасць да ворагаў з найглыбейшай адданасцю справе свайго народа, сваёй партыі.

Усё сваё свядомае жыццё, з маладых год, прысвяцілі Вы справе вызвалення рабочага класа і таржаства соцыялізма. Яшчэ пры царызме, высока трымаючы сцяг ленінскай партыі, Вы нястомна змагаліся за звяржэнне царызма, за перамогу рэволюцыі. Вы правялі выдатную работу па будаўніцтву нашай партыі як да рэволюцыі, так і пасля перамогі дыктатуры пролетарыята. Вы ў якасці члена Петраградскага Ваенна-Рэволюцыйнага Камітэта ў дні Кастрычніцкай рэволюцыі змагаліся за таржаство совецкай улады. Усе годы соцыялістычнай рэволюцыі ў якасці партыйнага і совецкага кіраўніка на ўсіх этапах барацьбы за перамогу ленінізма, за знішчэнне ворагаў комунізма з усёй прынцыповай паслядоўнасцю неслі Вы баявы сцяг партыі Леніна—Сталіна.

Ваша пяцідзесяцігоддзе супадае з дзесяцігоддзем Вашага прабывання на пасту Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР, дзесяцігоддзем, насычаным выдатнымі падзеямі як ва ўнутраным жыцці нашай вялікай радзімы, так і ў міжнародных адносінах.

За гэтыя дзесяць год совецкая краіна пад кіраўніцтвам нашага вялікага Сталіна дабілася бліскучых перамог на ўсіх участках барацьбы за соцыялізм. За гэтыя годы ў СССР затаржаствавалі і ўвасобіліся ў жыццё вялікія прынцыпы соцыялізма. На працягу ўсіх гэтых год Вы былі і застаецеся бліжэйшым памочнікам таварыша СТАЛІНА ў справе пабудовы ў СССР соцыялізма, у справе арганізацыі совецкай соцыялістычнай гаспадаркі, новага соцыялістычнага грамадства, новай соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

У сваёй паўсядзённай дзяржаўнай рабоце на пасту главы совецкага ўрада Вы паказваеце ўзор ажыццяўлення ўказанняў дырэктыў партыі, выхоўваючы ў кіраўніках і ўсіх работніках дзяржаўнага апарата глыбокую адданасць справе Леніна—Сталіна, пачуццё адказнасці і свядомасці свайго партыйнага і дзяржаўнага доўгу ў рабоце.

У сваёй рабоце па арганізацыі народнай гаспадаркі, па распрацоўцы і ажыццяўленню пяцігадовых планаў, па ўздыму соцыялістычнай культуры Вы заўсёды і нязменна паказваеце і вучыце, як патрэбна па-большэвіцку, па-сталінску рашаць гэтыя пытанні.

Як выдатны партыйны і дзяржаўны дзеяч, Вы нястомна працуеце над умацаваннем совецкай дзяржавы, няўхільна выкрываючы спробы ворагаў народа развінціць і падарваць магутнасць совецкага дзяржаўнага апарата.

Як выдатны арганізатар совецкай эканомікі і культуры, Вы аддаеце ўсе свае сілы на ўмацаванне гаспадарчай магутнасці Совецкага Саюза, на справу ўздыму культурнага і матэрыяльнага дабрабыту працоўных нашай радзімы, на згуртаванне ўсіх народаў нашай радзімы вакол совецкай улады і партыі Леніна—Сталіна.

У якасці главы совецкага ўрада і народнага камісара замежных спраў, Вы з'яўляецеся верным і паслядоўным праваднікам ленінска-сталінскай знешняй палітыкі совецкай дзяржавы, змагаючыся за таржаство справы міру ў міжнародных адносінах і няўхільна ажыццяўляючы клопаты аб умацаванні абароназдольнасці нашай дзяржавы, магутнасці і славы нашай непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

У Вашай асобе мы вітаем главу совецкага ўрада, друга і памочніка нашага вялікага настаўніка і правадыра таварыша СТАЛІНА.

Няхай жыве вялікая партыя ЛЕНІНА—СТАЛІНА!

Няхай жыве правадыр соцыялістычнай дзяржавы — вялікі СТАЛІН!

Няхай жыве глава совецкага ўрада Вячаслаў Міхайлавіч МОЛАТАЎ!

Совет Народных Камісараў Саюза ССР.

ДАРАГІ ТАВАРЫШ МОЛАТАЎ!

У дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік горача вітае Вас—вернага сына комуністычнай партыі, слаўнага кіраўніка ўрада соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, нястомнага барацьбіта за справу Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Слаўны шлях к дню свайго пяцідзесяцігоддзя пройдзен Вамі—выхаванцам вялікай партыі Леніна—Сталіна. Працуючы ў радах большэвіцкай арганізацыі пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, Вы заўсёды выступалі як рашучы барацьбіт за паслядоўна рэволюцыйную ленінскую лінію. Змрочныя годы сталыпінскай рэакцыі, арышты і ссылкі не пахісталі Вашу стойкасць, мужнасць і рэволюцыйную самаадданасць у барацьбе з царызмам і буржуазіяй.

У Кастрычніцкія дні 1917 года, Вы, як бліжэйшы саратнік Леніна і Сталіна, знаходзіліся ў штабе, кіраўніком штурму капіталістычнага ладу, і з'яўляліся адным з арганізатараў пабеданоснага ўзброенага паўстання рабочых і сялян.

Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Вы працавалі на адказных участках дзяржаўнага і партыйнага будаўніцтва, арганізуючы працоўных на барацьбу за перамогу Совецкай рэспублікі.

У наступныя годы жорсткай барацьбы супроць агентуры капіталістычнага акружэння пролетарыі, працоўныя ведаюць Вас як бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, як непахіснага кіраўніка ў барацьбе за соцыялізм.

Ваша непрымірымасць да ўсякіх скажэнняў марксізма-ленінізма, няўхільная паслядоўнасць у правядзенні генеральнай лініі партыі, бязлітаснасць у барацьбе з ворагамі партыі і народа заўсёды будуць служыць прыкладам ленінска-сталінскай партыйнасці.

У сваёй дзяржаўнай рабоце на пасту старшыні Совета Народных Камісараў СССР Вы з'яўляецеся ўзорам бліскучага спалучэння партыйнага і дзяржаўнага дзеяча ленінска-сталінскай эпохі.

Пад Вашым практычным кіраўніцтвам ажыццяўляліся сталінскія пяцігодкі, разгортвалася грандыёзная работа па ўмацаванню эканамічнай і абароннай магутнасці Совецкай дзяржавы.

Ва ўмовах выключных ускладненняў у міжнародных адносінах, разгарнуўшайся другой імперыялістычнай вайны, на Вас ускладзена непасрэднае кіраўніцтва знешняй палітыкай совецкай дзяржавы. Гэтыя задачы Вы паспяхова вырашаеце ў інтарэсах бяспаснасці СССР і забеспячэння мірнай працы народаў Совецкага Саюза.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, адзначаючы Вашы велізарныя заслугі перад соцыялістычнай радзімай, шле Вам свае гарачыя пажаданні яшчэ доўгія і доўгія годы жыць і працаваць на блага і шчасце народаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза ССР.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Аб пераймёнаванні горада Пермі ў горад Молатаў і Пермскай області ў Молатаўскую область.

Ідучы на сустрач пажаданням грамадскіх арганізацый горада Пермі і Пермскай вобласці, перайменаваць горад Перм у горад Молатаў і Пермскую вобласць у Молатаўскую вобласць.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль,
8 сакавіка 1940 г.

Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР

ТАВАРЫШУ МОЛАТАВУ ВЯЧЭСЛАВУ МІХАЙЛАВІЧУ

ад Галоўнага Ваеннага Совета Чырвонай Арміі

Галоўны Ваенны Совет ад імені Чырвонай Арміі ў дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя шле Вам, бліжэйшаму саратніку Леніна і Сталіна, сваё чырвонаармейскае прывітанне і гарачыя віншаванні.

Разам з Леніным і Сталіным Вы, таварыш Молатаў, будавалі магутную партыю большэвікоў, разам з імі Вы вялі партыю і рабочы клас на пабеданоснае ўзброенае паўстанне ў Кастрычніку 1917 г. і на заваяванне дыктатуры пролетарыята.

У годы грамадзянскай вайны, займаючыся палітычнай асветай Чырвонай Арміі, Вы кавалі перамогу на фронтах грамадзянскай вайны.

З першых дзён стварэння Чырвонай Арміі Вы сталі любімым яе другам. Ваша нястомнае кіраўніцтва і сталінскія клопаты, як главы совецкага ўрада, аб Чырвонай Арміі забяспечылі яе крэпасць і сакрушальную магутнасць у баях з ворагамі нашай радзімы.

Ваша бязлітаснасць на ўсіх этапах да ворагаў нашай большэвіцкай партыі і соцыялістычнай радзімы служыць узорам для кожнага байца, камандзіра і палітработніка Чырвонай Арміі.

З Вашым іменем, як главы совецкай дзяржавы, звязаны вялікія гістарычныя перамогі ў нашай краіне і ўмацаванне магутнасці соцыялістычнай дзяржавы.

Па Вашаму загаду, як главы совецкай дзяржавы, 17 верасня 1939 года Чырвоная Армія з лозунгамі „За радзіму“, „За вялікага Сталіна!“ разбіла хвастлівую белапанскую зграю і вызваліла трынаццаць мільёнаў адзінакроўных братоў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Цяпер байцы Ленінградскай Ваеннай Акругі, абараняючы паўночна-заходнюю граніцу нашай радзімы і ліквідуючы ачаг імперыялістычнай вайны, па загаду совецкага ўрада грамяць з той-жа сілай манергеймаўскія войскі.

У дзень Вашага слаўнага пяцідзесяцігоддзя, таварыш Молатаў, жадаем Вам жыць доўгія і доўгія годы на блага працоўных нашай радзімы.

Галоўны Ваенны Совет

24 САКАВІКА — ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР і БССР

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 338 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Самуіл Сямёнавіч Касцюк

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

У 1936 годзе ў Барысаўскім раёне БССР шырока разгарнуўся рух за ўраджай 500 цэнтнераў бульбы з гектара. У калгасах раёна было створана многа звенняў высокага ўраджаю, якія добра вывучылі распрацаваныя райземаддзелам правілы агратэхнікі бульбы і прытрымліваліся іх пры доглядзе за пасевамі. Вынікі апраўдалі надзеі. Каля 40 калгасных звенняў дабіліся ўраджаю больш 500 цэнтнераў бульбы з гектара. Высокі ўраджай атрымалі і астатнія звенні. Раён заняў па ўраджаю бульбы другое месца па Совецкаму Саюзу (першае заняла Калуга).

Ініцыятарам гэтага знамянальнага руху быў загадчык Барысаўскім райземаддзелам Самуіл Сямёнавіч Касцюк. Аграном па адукацыі, ён сам распрацоўваў правілы агратэхнікі бульбы.

Самуіл Сямёнавіч падняў калгаснае сялянства на барацьбу за высокі ўраджай бульбы, перамагаючы ўпартае супраціўленне з боку варожых элементаў, якія тады прабраліся ў Наркамзем БССР. Калі Наркамзем выказаўся супроць прапаноў райземаддзела, тав. Касцюк разам з аграномам Глухам і двума звеннявымі выехаў у Маскву. Газета «Социалистическое земледелие» арганізавала яму сустрэчу з буйнейшымі спецыялістамі агратэхнікі бульбы, навуковымі супрацоўнікамі бульбянага інстытута і правяла нараду. Навуковыя спецыялісты адобрылі прадстаўленыя правілы. Самуіл Сямёнавіч, пераканаўшыся ў сваёй праваце, вярнуўся ў раён і склікаў нараду передавікоў сельскай гаспадаркі, якая падтрымала прапанову райземаддзела. У раёне пачалася барацьба за высокі ўраджай бульбы. Многія з звеннявых упаследку былі ўзнагароджаны ўрадам.

* * *

Самуіл Сямёнавіч Касцюк нарадзіўся ў сям'і селяніна-бедняка з вёскі Русінавічы, Самахвалавіцкага сельсовета, Мінскага раёна.

15-гадовым хлапчуком Самуіл уступіў у рады комсамола і адразу-ж прыняў актыўны ўдзел у комсамольскім жыцці. Ён арганізаваў комсамольскую ячэйку ў роднай вёсцы і разгарнуў культурную работу. Пабудавалі клуб, арганізавалі драмгурток. Вясковая моладзь пацягнулася да культурнага жыцця.

У 1924 годзе ЦК ЛКСМБ накіраваў тав. Касцюка ў Барысаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум. І ў тэхнікуме тав. Касцюк аддаваў многа ўвагі комсамольскай рабоце. Ён быў членам, а затым сакратаром комсамольскага камітэта тэхнікума, старшынёй студэнцкага профсаюзнага камітэта, а ў 1926 і 1927 гадах членам Барысаўскага райкома і акругкома ЛКСМБ.

Актыўна працуючы ў комсамоле, тав. Касцюк у 1926 годзе ўступіў у кандыдаты партыі, а ў 1928 годзе яго прынялі ў члены КП(б)Б. У гэтым-жа годзе ён скончыў агратэхнікум. Сын беларускага непісьменнага селяніна стаў аграномам. Райком КП(б)Б накіраваў тав. Касцюка для ўмацавання работы ў акруговую школу сялянскай моладзі ў Казімірава. Тут ён працаваў выкладчыкам аграноміі, а пасля пераводу школы ў Блонь — загадчыкам школы.

Працуючы ў школе, тав. Касцюк выконваў значную партыйную работу. Ён быў сакратаром Жыткавіцкай ячэйкі КП(б)Б. У часы яго работы Жыткавіцкі сельсовет быў перадавым па правядзенню сельска-гаспадарчых кампаній.

Вясной 1931 года тав. Касцюка паслалі старшынёй Барысаўскага райкалгассаюза. У гэтыя годы Самуіл Сямёнавіч быў арганізатарам калектывізацыі сялянства ў Барысаўшчыне. З 1933 года тав. Касцюк працаваў загадчыкам Барысаўскага райземаддзела. За час яго работы ў райза Барысаўскі раён нязменна займаў передавыя месцы ў рэспубліцы па сельска-гаспадарчых кампаніях.

У канцы 1936 года ЦК КП(б)Б накіраваў тав. Касцюка старшынёю райвыканкома, а затым першым сакратаром райкома новага Кіраўскага раёна.

Цэнтр Кіраўскага раёна быў у невялікай вёсцы. Але за годы работы ў ім тав. Касцюка Кіраўск вырас у буйны раённы цэнтр з электрастанцыяй, школай 10-годкай, бальніцай, амбулаторыяй, радзільным домам і іншымі грамадскімі ўстановамі. У ім пабудавалі каля 400 новых дамоў. Будучы сакратаром райкома, тав. Касцюк удзяляў вялікую ўвагу пытанням сельскай гаспадаркі. За ўраджаі, перавысіўшыя сярэднія па вобласці, і перавыкананне планаў гадоўлі маладняка па Кіраўскаму раёну тав. Касцюк зацверджан удзельнікам сельскагаспадарчай выстаўкі ў Маскве і занесен у Пачотную кнігу выстаукі.

Вераснеускія дні 1939 года. Выконваючы волю народа, слаўная Чырвоная Армія прынесла вызваленне прыгнечаным братам, беларусам і украінцам. ЦК КП(б)Б паслаў тав. Касцюка з групай таварышоў у Заходнюю Беларусь.

Як толькі горад Баранавічы быў вызвален ад белапанскіх акупантаў, камандаванне арміі назначыла тав. Касцюка на работу ў Часовае Упраўленне гор. Баранавічы. Праз некалькі дзён яго назначылі старшынёй Часовага Упраўлення.

У гэты час у Баранавічах пэпэсаўскія кіраўнікі з віцэ-бурмістрам горада стварылі сваю ўзброеную ахову з пэпэсаўцаў і шпікаў. Тав. Касцюк, прыбыўшы ў Баранавічы, удвух з тав. Масарскім з'явіліся ў магістрат. У адным з пакояў яны убачылі чалавек трыццаць чыноўнікаў магістрата і пэпэсаўскіх кіраўнікоў. Большасць з іх была ўзброена. Тав. Касцюк адразу загадаў ім:

— Неадкладна здайце зброю!

«Начальства» збянтэжылася, захвалявалася і... адзін за другім пачалі складаць зброю на стол. Так 16 чыноўнікаў і пэпэсаўскіх кіраўнікоў здалі 26 рэвальвераў. Пасля гэтага Часовае Упраўленне распусціла створаную пэпэсаўцамі ахову і, апіраючыся на передавых рабочых, прыступіла да аднаўлення парадку ў горадзе.

Наступілі дні гарачай бесперапыннай работы. Часовае Упраўленне разгарнула ў горадзе і павеце будаўніцтва. Пабудавалі памяшканні для сярэдніх школ, адбудавалі разбураныя бамбардзіроўкай у часы польска-германскай вайны жылыя дамы, будаваліся школы ў павеце.

На будаўнічых работах было занята 3 тысячы рабочых, якія пры польскай уладзе былі беспрацоўнымі. Усе прамысловыя прадпрыемствы, спыненыя ў сувязі з польска-германскай вайной, былі пушчаны ў ход, павялічылася колькасць рабочых змен. Гэта дало дадатковую работу сотням беспрацоўных.

У сувязі з адменай платы за вучобу па гораду і павету пачалася цяга дзяцей у школу. Часовае Ўпраўленне, каб задаволіць гэтую цягу, адкрыла 37 новых школ і каля 50 паралельных новых класаў. 230 беспрацоўных настаўнікаў атрымалі работу. У горадзе адкрыліся вячэрнія школы для дарослых, у якіх вучыліся больш 500 чалавек.

Карэнным чынам змяніла Часовае Ўпраўленне становішча медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Было ўведзена бясплатнае лячэнне працоўных, адкрыты амбулаторыі, дзіцячыя кансультацыі, хуткая дапамога і дзесяткі іншых лячэбных устаноў. Каля 100 медыцынскіх работнікаў атрымалі работу.

Батракі, беззямельныя і малазямельныя сяляне атрымалі памешчыцкую зямлю, бескароўныя і бясконныя гаспадаркі атрымалі кароў і коней. Спынілася разарэнне сялянства.

Жыццё у гор. Баранавічах і павеце было наладжана. Рашэннем ЦК КП(б)Б ў канцы лістапада тав. Касцюк быў паслан другім сакратаром Беластоцкага абкома КП(б)Б, дзе ён працуе і зараз.

Працоўныя 338 выбарчай акругі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР вылучылі адданага сына партыі Леніна — Сталіна Самуіла Сямёнавіча Касцюка кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Тав. Касцюк апраўдае давер'е выбаршчыкаў, будзе да канца адданым большэвіком, верным сынам соцыялістычнай радзімы.

І. Каралёкоў.

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ПА 600 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Філіп Сямёнавіч Пестрак

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Філіп Сямёнавіч Пестрак нарадзіўся ў 1904 годзе ў глухой палескай вёсцы Сакоўцы. У 1914 годзе, калі пачалася сусветная вайна, царскі ўрад эвакуіраваў сям'ю Пестракоў у Самарскую губерню. Бацька быў на фронце. У сям'і — шасцёра дзяцей, старэйшаму з якіх, Філіпу, — 11 год. У час эвакуацыі на адной з глухіх станцый маці адстала ад эшалона. Усе клопаты аб вялікай сям'і з малымі дзецьмі прышлося ўзяць на сябе 11-гадоваму Філіпу.

У Самарскай губерні сям'я Пестракоў жыла да 1920 года. Увесь гэты час Філіп працаваў батраком у кулакоў і багацеяў. Удалося скончыць толькі пачатковую школу. Было жаданне вучыцца далей, але трэба было зарабляць на хлеб.

Толькі Кастрычніцкая рэволюцыя адкрыла для Пестрака дзверы ў сярэднюю школу. У 1919 годзе тав. Пестрак уступае ў комсамол, дзе становіцца сакратаром ячэйкі, адначасова працуе ў валасным выканкоме, кіруе культасветным гуртком.

У канцы 1920 года сям'я Пестрака пераязджае на радзіму — у палескую вёску Сакоўцы. Пестраку думалася, што і там, у яго краі, запанавала лепшая доля. Але рэчаіснасць вышчэрылася вострымі клыкамі: тут аджылі магнаты, памешчыкі і капіталісты, якія па-ранейшаму смакталі кроў працоўных.

На працягу двух тыдняў у Пестрака памірае бацька, сястра і брат. Купіць труны не было за што. Пестрак адрывае аполкі ад дзедаўскай хаты і ўласнымі рукамі робіць труны для родных. Потым сам захварэў тыфам.

Ачуняўшы ад хваробы, ледзь трымаючыся на нагах, у снежную зіму ідзе на працу. За ўдзел у забастоўцы грузчыка Пестрака праганяюць з работы. І потым на працягу доўгага часу на работу не прымалі.

У 1924 г. тав. Пестрак уступае ў комсамол Заходняй Беларусі. Першы раз арыштавалі ў лютым 1927 года ў час Косаўскай крывавай дэманстрацыі. Прасядзеў пад следствам 6 месяцаў і быў выпушчан пад нагляд паліцыі. Па выхадзе з турмы тав. Пестрак працуе сакратаром акруговай управы „Таварыства беларускай школы“ у Косаве. Стараецца стварыць спажывецкі кааператыў, але да гэтага панскія ўлады не дапусцілі.

У 1929 г. у студзені арыштавалі другі раз, і Гродненскім акруговым судом тав. Пестрак прысуджаецца да 5 год, якія адсядзеў у гродненскім астрозе. У 1933 г. у верасні вышаў на волю і зноў пайшоў на падпольную работу. Папрацаваў толькі 5 месяцаў і быў арыштаваны.

Дэфензіва. Непрызнанне. Два гады ў пінскай катоўні-турме. Пераводзяць у Вільна, у Лукішкі. Суд. Віленскім акруговым і апеляцыйным судом прыгаворан да 8 год.

Цёмныя казематы гродненскай турмы. Карцары. Цвёрдыя ложы. Кара пастом. Здзекі. Галадоўкі. Там, у турэмных казематах, Філіп Пестрак тварыў свае выдатныя, пачуццёвыя вершы. Ён „пісаў“ без паперы і чарніла — усе складзеныя радкі былі ў памяці. У сваіх вершах ён заклікаў да барацьбы. Пачаўшы друкавацца яшчэ ў 1927 г., тав Пестрак толькі зараз, пасля прыходу Чырвонай Арміі, можа лягальна выдаваць свае творы. У друк здана яго кніга вершаў „З паходняй на варце“. Народжаныя кроўю сэрца ў казематах палкія радкі сталі здабыткам вызваленага народа.

Пестрак прасядзеў у турме 11 год і быў вызвалены, дзякуючы Рабоча Сялянскай Чырвонай Арміі.

За 5 дзён да прыходу Чырвонай Арміі ў горадзе Гродна ўжо нікога не было з панскіх улад і паліцыі. Палітычныя зняволечыя былі звольнены „стражай обывательскай“, якая з'яўлялася адзіным органам улады ў горадзе.

Тав Пестрак расказвае:

— Рабочыя павялі нас у былы камісарыят паліцыі, дзе нам была падрыхтавана ежа. Калі мы прышлі туды, то ўбачылі там многа пакіданых паліцыяй вінтовак, патронаў, наганаў. Раптам даносіцца вестка, што азонаўцы хочуць нас акружыць і арыштаваць. Быў кінут лозунг: „За зброю!“ Усе таварышы ўзброіліся. Недалёка недзе стракатаў кулямёт. І таварышы пачалі страляць з карабінаў. Але мы не мелі кіраўніцтва, якое б ведала горад і магло павесці нас. Прышоў адзін рабочы і сказаў: „За мной! Толькі дайшоў да вулічнай брамы, як упаў трупам на месцы. Куля прабіла грудзі. Аказваецца, вуліцы былі абстаўлены кулямётамі і за вугламі хаваліся азонаўцы. Па нас стракатаў кулямёт. Кулі свісталі каля вушэй. Азонаўская варта не спала. Яна лавіла адзіночныя групы ўцякаючых палітзняволеных. З паднятымі ўверх рукамі вяла назад у турму“.

І тав. Пестрак зноў у турме. Па турэмных карыдорах стаялі дазорцы з рэвальверамі ў руках. Зноў тыя-ж камеры. Паўстае пытанне: што будзе далей? Павісла ракавое слова — смерць, расстрэл за спробу ўцячы. Аказваецца, гэтае звальненне было правакацыйным. Тав. Пестрак разам з актывістамі праводзіць работу сярод таварышаў, каб стойка і мужна трымаліся, каб сустрэлі смерць, як належыць большэвікам.

— Але шчасце нас не мінула, — працягвае свой расказ тав. Пестрак. — Раніцой пачалася частая кулямётная страляніна, якая к вечару перайшла ў артылерыйскую перастрэлку. „Хто з кім б'ецца?“ — пытанне, якое турбавала ўсіх нас. Загудзелі самалёты. Таварышы ў вокны. З самалётаў падаюць лістоўкі. Але не разбярэш — чые самалёты. Раптам стук у сцяну з суседняй камеры. Запрацавала Марзе. Я прылажыў вуха — падбіраю. Перадаюць, што бачылі тры совецкія самалёты. Пытаю, адкуль ведаеце, што совецкія. Адказваюць, бачылі на самалётах пяцівугольную звязду. І бачылі напэўна.

На трэці дзень раніцой адчыняюцца дзверы камеры. На турэмны карыдор увайшла рабочая міліцыя горада з вінтоўкамі і чырвонымі стужкамі на рукавах. Цяжка перадаць мінуты, якія перажылі былыя палітзняволеныя. З лозунгамі, радаснымі воклічамі яны выходзяць з камер і вітаюцца, цалуюцца з міліцыянерамі...

Зараз-жа па выхадзе з турмы ствараецца рэўком. Тав. Пестрак — сакратар рэўкома. Рэўком наводзіць свой парадак у турме. Ствараецца чырвоная міліцыя з усіх палітзняволеных. Частка ўваходзіць у турэмную адміністрацыю, астатнія групамі ідуць у горад. У горадзе спакойна. Развіваюцца чырвоныя сцягі. На вуліцах групамі праходзяць чырвонаармейцы. Новы свет — новае жыццё. Тав. Пестрак — член камітэта рабочай міліцыі Гродна. Далей — супрацоўнік газеты „Свабодная Беларусь“, старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Народнае Сабране, член Паўнамоцнай Камісіі...

Тав. Пестрак пабываў у Маскве і Мінску. Ён дачакаўся шчаслівага моманту, каб уласнымі вачыма ўбачыць, як куецца новае жыццё пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і таварыша Сталіна.

Працоўная інтэлігенцыя гор. Гродна вылучыла Філіпа Сямёнавіча Пестрака кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР. Тав. Пестрак гаворыць: „Я адчуваю сябе нязмерна шчаслівым. Я магу цяпер усяго сябе аддаць свайму народу“.

Галасуйце за тав. Пестрака — вернага сына беларускага народа!

Т. Лясовіч.

У ДАПАМОГУ ВЫВУЧАЮЧЫМ ГІСТОРЫЮ ВКП(б)

ВОСЕМНАЦЦАТЫ З'ЕЗД ВКП(б)

Восемнаццаты з'езд ВКП(б) з'явіўся велізарнай падзеяй у жыцці нашай партыі і ўсёй краіны. Гэта быў з'езд, які меў усе падставы заявіць, што, ажыццявіўшы ў асноўным першую фазу комунізма — соцыялізм, Совецкі Саюз уступіў у паласу завяршэння будаўніцтва бяскласазага соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма.

Перыяд ад XVII да XVIII з'езда з'явіўся рашаючым у гісторыі будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне: ліквідаваны ўсе эксплаататарскія класы; знішчаны прычыны, якія параджаюць класавую няроўнасць і эксплаатацыю чалавека чалавекам, падзел грамадства на эксплаататараў і эксплаатуемых. Наша грамадства складаецца з двух дружэственых адзін другому класаў — рабочых і сялян, а таксама совецкай народнай інтэлігенцыі. Створана маральна-палітычнае адзінства совецкага народа. Дзве вялікія сілы — народ і комунізм — зліліся ў адно.

За дзве сталінскія пяцігодкі СССР ператварыўся ў магутную індустрыяльную дзяржаву.

Па тэмпах развіцця і па ўзроўню тэхнікі вытворчасці совецкая індустрыя стаіць на першым месцы ў свеце. Тэмпы развіцця нашай прамысловасці ў 7,5 раза быстрэй, чым у Злучаных Штатах Амерыкі, у 8 разоў быстрэй, чым у Англіі, у 6,9 разоў быстрэй, чым у Германіі. Доля прамысловай прадукцыі СССР у сусветнай прадукцыі вырасла ў 1938 годзе да 15,8 проц., тады як у 1913 годзе яна складала толькі 2,7 проц.

Велізарныя поспехі атрыманы ў галіне павышэння прадукцыйнасці працы, што, у канечным рахунку, як вучыць нас Ленін, з'яўляецца самым важным і самым галоўным у справе перамогі новага грамадскага ладу. У прамысловасці прадукцыйнасць працы ў другой пяцігодцы ўзнялася на 82 проценты супроць 63 процантаў па плану. Прадукцыйнасць працы ў СССР расце ў сярэднім у 4—5 разоў быстрэй, чым у любой капіталістычнай краіне.

Карэнным чынам змяніўся воблік сельскай гаспадаркі.

«...Калгасы канчаткова і трывала замацаваны. А соцыялістычная сістэма гаспадаркі з'яўляецца цяпер адзінай формай нашага земляробства» (Сталін). Наша сельская гаспадарка з'яўляецца самай буйнай і самай механізаванай ва ўсім свеце. За перыяд паміж XVII і XVIII з'ездамі ў два з лішнім разы павялічылася колькасць МТС, у тры разы — магутнасць трактарнага парка, у 6 разоў — лік камбайнаў. Тры чвэрці ўсёй пахаці калгасаў к канцу другой пяцігодкі апрацоўваліся трактарамі МТС.

Узброеная перадавой машыннай і агранамічнай тэхнікай, соцыялістычная сельская гаспадарка дае багатыя ўраджаі, паспяхова выконваецца сталінскае заданне аб штогодняй вытворчасці 7—8 мільярдаў пудоў зярна.

За годы совецкай улады ў нашай краіне адбылася сапраўдная культурная рэволюцыя. Адсталасць і бескультур'е знішчаны назаўсёды. У 1939 годзе ў нас навучалася больш адной чацвёртай часткі насельніцтва (з улікам усіх відаў навучання). Лік студэнтаў у вышэйшых навучальных установах СССР значна большы, чым у Германіі, Англіі, Францыі, Італіі і Японіі, разам узятых.

Совецкі народ жыве заможным і культурным жыццём, яго дабрабыт павышаецца з кожным годам. Толькі за другую пяцігодку больш чым у два разы ўзрасло народнае спажыванне, у тры разы павялічыліся выдаткі на культурна-бытавое абслугоўванне працоўных, удвая павысілася рэальная заработная плата рабочых, амаль у пяць разоў вырас народны даход. Аб гэтым сведчаць сумы ўкладаў насельніцтва ў ашчадныя касы — за дзве сталінскія пяцігодкі яны выраслі больш чым у 20 разоў.

У корані змяніўся матэрыяльны дабрабыт калгаснага сялянства. Грашовыя даходы па працаднях у 1937 годзе ў параўнанні з 1934 годам павялічыліся ў чатыры разы. Поўнасцю ліквідавана бескароўнасць калгаснікаў. З'явілася вялікая колькасць калгасаў-мільянераў. У 2,5 раза ўзрасла натуральная частка працадня.

Не гледзячы на велізарныя поспехі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, наша краіна ўсё яшчэ працягвае адставаць ад найбольш развітых капіталістычных краін у эканамічных адносінах, у адносінах размераў вытворчасці на душу насельніцтва. Гэта адставанне тлумачыцца неймавернай тэхнічнай адсталасцю нашай краіны ў мінулым. У 1913 годзе па аб'ёму прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва Расія адставала больш чым у 20 разоў ад Амерыкі, у 14 разоў — ад Англіі, амаль у 8 разоў — ад Францыі.

Восемнаццаты з'езд ВКП(б) паставіў перад нашай краінай велічную задачу — на працягу бліжэйшых 10—15 год дагнаць і перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах. Гэта значыць, што Совецкі Саюз павінен стаць і стане перадавой краінай свету, краінай соцыялістычнага багацця.

Рашэнне асноўнай эканамічнай задачы СССР мае выключнае значэнне: ад яе паспяховага вырашэння будзе залежыць магчымасць пераходу да вышэйшай фазы комунізма, ажыццяўленне асноўнага прынцыпа комунізма — «ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго патрэбнасцях». «Толькі ў тым выпадку, калі перагонім эканамічна галоўныя капіталістычныя краіны, мы можам разлічваць, што наша краіна будзе поўнасцю насычана прадметамі спажывання, у нас будзе багацце прадуктаў, і мы атрымаем магчымасць зрабіць пераход ад першай фазы комунізма да другой яго фазы» (І. Сталін. Даклад на XVIII з'ездзе ВКП(б).

Ці ёсць у нас умовы для паспяховага вырашэння гэтай задачы?

Так, ёсць. Мы стаім наперадзе ўсіх краін па ўзроўню тэхнікі вытворчасці ў прамысловасці і ў сельскай гаспадарцы. У наяўнасці велізарны рост тэхнічнай асветы і культуры народа, магутны ўздым народнага дабрабыту. Па тэмпах развіцця народнай гаспадаркі мы ідзем наперадзе ўсіх капіталістычных краін. СССР мае самае перадавое ў свеце соцыялістычнае земляробства. Соцыялістычная сістэма гаспадаркі не ведае эканамічных крызісаў, беспрацоўя. У совецкім народзе закладзены невычарпальныя крыніцы працоўнага гераізма, магутныя рэзервы няўхільнага росту прадукцыйнасці працы. На чале народа стаіць непераможная, мудрая партыя Леніна—Сталіна.

У праграме работ па выкананню асноўнай эканамічнай задачы СССР выключнае значэнне надаецца трэцяму пяцігадоваму плану. «Выкананне трэцяга пяцігадовага плана, — гаварыў таварыш Молатаў, — у многім павінна прадрашыць вырашэнне гэтай задачы». Так, напрыклад, к канцу трэцяй пяцігодкі прамысловая прадукцыя СССР перавысіць прадукцыю Германіі, Італіі і Японіі, разам узятых. Па ўзроўню вытворчасці машын на душу насельніцтва мы абгонім усе еўрапейскія краіны. СССР будзе далёка наперадзе Англіі, Францыі і Германіі па агульнай выпрацоўцы электраэнергіі, па вытворчасці чыгуну, сталі і т. д.

Вядучая роля ў трэцяй пяцігодцы астаецца за машынабудаўніцтвам, якое павінна забяспечыць новы ўздым тэхнічнага ўзбраення ўсёй народнай гаспадаркі і абароны краіны. Магутнае развіццё атрымаюць усе галіны прамысловасці і ў першую чаргу цяжкая індустрыя. Аб'ём усёй прамысловай прадукцыі СССР на апошні год трэцяй пяцігодкі ўстаноўлен у 184 мільярды рублёў, што дасць рост у параўнанні з другой пяцігодкай на 92 проценты.

Пасля выканання трэцяга пяцігадовага плана мы будзем вырабляць прамысловай прадукцыі ў 15 разоў больш, чым у даваенны час. Сярэднегадавы прырост прадукцыі ў трэцяй пяцігодцы ўстаноўлен у 14 процантаў. Прадукцыйнасць працы павінна ўзняцца на 65 процантаў. У 1942 годзе толькі за кошт павелічэння прадукцыйнасці працы будзе забяспечан прырост прадукцыі супроць 1937 года на 62 мільярды рублёў.

* * *

Важнейшай задачай, якую паставіў XVIII з'езд ВКП(б) перад совецкім народам, з'яўляецца комуністычнае выхаванне працоўных, знішчэнне перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей. Гэта задача мае рашаючае значэнне ва ўсёй нашай рабоце па будаўніцтву комунізма. «Каб па-сапраўднаму асвядоміць і з максімальнымі практычнымі рэзультатамі выкарыстаць у інтарэсах народа нашы палітычныя, нашы эканамічныя, нашы культурныя, нашы арганізацыйныя і ўсе іншыя велізарныя магчымасці, — гаварыў таварыш Молатаў, — нам больш за ўсё неабходна ў даны перыяд усямернае павышэнне справы комуністычнага выхавання». У першую чаргу гутарка ідзе аб выхаванні ва ўсіх грамадзян соцыялістычных адносін да працы і да грамадскай уласнасці.

Побач з перадавымі людзьмі нашай краіны, якія свядома і самааддана змагаюцца за пабудову комунізма і за якімі ідзе падаўляючая маса рабочых і сялян, у нас ёсць нямала людзей адсталых, несвядомых, нядобрасумленных — летуноў, рвачоў, прагульшчыкаў, разгільдзяяў, якія прыносяць велізарную шкоду соцыялістычнай дзяржаве. Такія людзі не прэч пажывіцца за кошт дзяржавы, пабольш урваць ад дзяржавы для сябе. Астатняе іх не цікавіць. «Таму патрэбна барацьба за інтарэсы дзяржавы, — гаварыў таварыш Молатаў, — і за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны ў нашых прадпрыемствах і ўстановах, патрэбна барацьба з лодырамі, разгільдзяямі і летунамі. Сярод сялян таксама не мала яшчэ такіх, якім няма справы не толькі да інтарэсаў дзяржавы, але і да інтарэсаў свайго калгаса, якія думаюць толькі аб тым, каб урваць для сябе пабольш і ў дзяржавы і ў калгаса. І тут патрэбны сур'ёзныя меры ў галіне ўмацавання дысцыпліны і ў галіне выхавання».

Перажыткі капіталізма даюць сябе знаць і ў быце, ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі (падхалімства, склокі, адсутнасць чулых адносін да дзяцей, пагардлівыя адносіны да жанчыны і г. д.). Кожная іх праява павінна сустракаць з боку нашай грамадскасці неадкладны і бязлітасны адпор.

Барацьба з перажыткамі капіталізма ў свядомасці працоўных уключае ў сябе, як неабходны і неразрыўны элемент, барацьбу супроць рэлігійных перажыткаў у свядомасці працоўных. Не зжыты яшчэ да канца перажыткі капіталізма ў нацыянальным пытанні (астаткі вялікадзяржаўнага шавінізма і мясцовага нацыяналізма) і г. д.

Многае прадстаіць зрабіць і для канчатковага ўстаранення былой процілегласці паміж горадам і вёскай.

Комуністычнае выхаванне працоўных і ўся работа па будаўніцтву комунізма стане яшчэ больш паспяховай тады, калі нашы кіруючыя кадры будуць нястомна аваладваць марксізмам-ленінізмам, павышаць свой тэарэтычны ўзровень. Таварыш Сталін на XVIII партыйным з'ездзе асабліва падкрэсліў велізарную ролю марксісцка-ленінскага выхавання кадраў. Калі-б мы здолелі ідэалагічна падрыхтаваць нашы кадры, гаварыў таварыш Сталін, калі-б мы здолелі іх зрабіць спелымі марксістамі-ленінцамі, «то мы мелі-б усе падставы лічыць дзевяць дзесятых усіх нашых пытанняў ужо вырашанымі».

Гістарычны даклад таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе ВКП(б), рашэнні з'езда з'яўляюцца каштоўнейшым укладам у марксісцкую навуку. Яны натхняюць совецкі народ і пралетарыяў усяго свету на свяшчэнную барацьбу за поўную перамогу комунізма, указваюць і асвятляюць шлях да перамогі.

У ліку пытанняў, якія атрымалі навуковую распрацоўку ў дакладзе таварыша Сталіна, галоўнае месца займаюць вучэнне аб соцыялістычнай дзяржаве і вучэнне аб совецкай інтэлігенцыі.

На аснове абагульнення дваццацігадовага вопыту нашай барацьбы і соцыялістычнага будаўніцтва, на аснове аналіза двух галоўных фаз развіцця нашага грамадства таварыш Сталін распрацаваў закончанае марксісцкае вучэнне аб соцыялістычнай дзяржаве, якая існуе ў капіталістычным акружэнні.

Таварыш Сталін даказаў, што ў нашых умовах усякія размовы аб адміранні соцыялістычнай дзяржавы, аб аслабленні яе магутнасці—наруку толькі нашым класавым ворагам. Таварыш Сталін вучыць, што соцыялістычная дзяржава павінна мацнець і развівацца, пакуль будзе існаваць капіталістычнае акружэнне.

Развіваючы далей вучэнне Маркса, Энгельса, Леніна, улічваючы велізарны вопыт нашай краіны, таварыш Сталін прадоўжыў ленінскую тэорыю аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў адной краіне да магчымасці пабудовы комунізма ў адной краіне ва ўмовах капіталістычнага акружэння. Таварыш Сталін паказаў, што дзяржава будзе існаваць і ва ўмовах комуністычнага грамадства, калі не будзе знішчана капіталістычнае акружэнне. Больш таго, толькі магутная соцыялістычная дзяржава і надзейная ахова совецкіх граніц у асобе нашай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота, з'яўляюцца сапраўднай гарантыяй нашых далейшых поспехаў, нашай работы па будаўніцтву комунізма.

Соцыялістычная дзяржава не аставалася нязменнай, указвае таварыш Сталін, а бесперапынна развівалася і ўдасканальвалася. Са змяненнем унутранай і знешняй абстаноўкі краіны змяняліся яе формы і функцыі. У цяперашні перыяд, калі ў нашай краіне поўнасцю знішчаны эксплаататарскія класы і пабудаван соцыялізм, асноўная задача дзяржавы ўнутры краіны заключаецца ў мірнай гаспадарча-арганізатарскай і культурна-выхаваўчай рабоце.

Стварыўшы вучэнне аб соцыялістычнай інтэлігенцыі, таварыш Сталін паклаў канец няправільным, пагардлівым адносінам да гэтай велізарнай арміі совецкіх людзей, указаў на неабходнасць «прыяцельскіх адносін да яе, клопатаў аб ёй, павагі да яе і супрацоўніцтва з ёй у імя інтарэсаў рабочага класа і сялянства».

Таварыш Сталін стварыў вучэнне аб кадрах — гэтым залатым фондзе партыі і дзяржавы, аб іх правільным падборы, аб вырошчванні і вылучэнні новых людзей, аб правільнай расстаноўцы кадраў, аб праверцы іх у працэсе работы, аб спалучэнні старых і маладых кадраў «у адным агульным аркестры кіруючай работы партыі і дзяржавы».

Вялікае значэнне ў жыцці нашай партыі маюць рашэнні з'езда аб змяненнях у статуце ВКП(б). Захоўваючы непахіснымі ленінска-сталінскія прынцыпы большэвізма, яны яшчэ вастрэй адточваюць арганізацыйную зброю партыі, яшчэ больш умацоўваюць яе сілу і магутнасць, робяць яе яшчэ больш боездольнай для паспяховага вырашэння гістарычных задач пабудовы комунізма. У новы Статут ВКП(б) уключан спецыяльны раздзел «Партыя і комсамол», прасякнуты выключным давер'ем партыі да комсамола і адкрывае перад моладдзю неабмежаваныя магчымасці для ўдзелу ў гаспадарчым і дзяржаўным будаўніцтве.

З'езд праходзіў у абстаноўцы выключнага аднадушша і арганізаванасці. Адзінства волі, адзінства дзеянняў, адзінства думак і пачуццяў, якімі была пранікнута ўся работа з'езда, сведчылі аб сіле і неперамажнасці нашай партыі, аб жалезнай згуртаванасці яе радоў, аб таржастве, аб поўнай перамозе ленінска-сталінскай генеральнай лініі партыі.

З'езд з асаблівай сілай падкрэсліў неабходнасць узмацнення нашай палітычнай пільнасці ў барацьбе з ворагамі, заклікаў бесперапынна памятаць словы таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні. Нашы поспехі павінны яшчэ больш завастрыць нашу зоркасць і адтачыць нашу зброю для бязлітаснага знішчэння ворагаў.

Рашэнні з'езда, які навукова абгрунтаваў праграму завяршэння будаўніцтва соцыялізма і паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма, выклікалі ў совецкага народа пачуццё законнай гордасці за пройдзены шлях, пачуццё бязмежнай радасці за поўную перамогу генеральнай лініі партыі. Разам з тым яны выклікалі новую хвалю вытворчага энтузіязма, неперамагальнага жадання будаваць, ісці наперад да новых і новых перамог.

З часу XVIII з'езда прайшоў год. Наша радзіма атрымала новыя выдатныя перамогі. Рашэнні з'езда паспяхова ператвараюцца ў жыццё. Тысячы прыкладаў пацвярджаюць іх мудрасць і вялікую сілу.

Нязменна ідзе ўгору наша соцыялістычная прамысловасць. Тэмпы яе развіцця нарасталі з квартала ў квартал, значна перавышаючы адпаведныя паказчыкі мінулага года. У сярэднім прадукцыя прамысловасці вырасла на 14,7 процанта, у той час як у 1939 годзе яе рост раўняўся 12 процантам.

Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці, па даных за 10 месяцаў 1939 года, павялічылася на 17 проц. А на прадпрыемствах цяжкага машынабудаўніцтва прадукцыйнасць працы ўзнялася на 22 проц. Зарадзіліся новыя формы стаханаўскага руху — многастаночнае абслугоўванне, сумяшчэнне прафесій, якія тояць у сабе найвялікшую будучыню.

Велізарныя поспехі стаханаўцаў калгасных і соўгасных палёў, няўхільны ўздым соцыялістычнага земляробства ярка і пераканаўча паказала Ўсесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка.

Магутны рост палітычнай актыўнасці працоўных мас паказалі праведзеныя нядаўна выбары ў мясцовыя советы дэпутатаў працоўных. Яшчэ раз з новай сілай выбары прадэманстравалі сілу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, велізарны аўтарытэт нашай партыі і яшчэ больш узмацнілі магутнасць нашай дзяржавы. Усе выбраныя дэпутаты з'яўляюцца кандыдатамі гэтага непераможнага блока. За кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, якія балатыраваліся ў абласныя советы, галасавала 99,02 процанта ўсіх прымаўшых удзел у выбарах; за кандыдатаў блока, вылучаных у раённыя советы — 98,72 проц.; у сельскія і пасялковыя советы — 98,04 проц. і г. д.

Паспяхова выконваецца праграма развіцця культуры, далейшага ўздыму дабрабыту працоўных. Мудрая палітыка большэвіцкай партыі і совецкага ўрада забяспечыла бліскучыя поспехі нашай краіны і ў галіне міжнародных адносін. Поўнасцю падцвердзіліся геніяльныя прадбачанні таварыша Сталіна.

Аналізуючы ў сваім дакладзе міжнароднае становішча, таварыш Сталін здолеў геніяльна разгадаць падкопы англа-французскіх падпальшчыкаў вайны і падкрэсліў, што вялікая і небяспечная палітычная гульня, завязаная імі, можа скончыцца для іх сур'ёзным правалам. Далейшыя падзеі поўнасцю падцвердзілі гэта.

Біта стаўка імперыялістаў на вайну СССР з Германіяй. Варожасці паміж двума вялікімі народамі пакладзен канец заключэннем совецка-германскага пакта аб ненападзе і дагаворам аб дружбе.

Сарваны план Англіі і Францыі ператварыць усход Еўропы ў крывавае пажарышча.

17 верасня 1939 года, дзень вызвалення заходніх абласцей Украіны і Беларусі, працоўныя назаўсёды захаваюць у сваёй памяці.

У дружную сям'ю народаў СССР улілося 13 мільёнаў новых совецкіх грамадзян. Па трапнаму выразу В. М. Молатава, у 1939 годзе капіталістычнаму свету прыйшлося крыху пацясніцца і адступіць, а Совецкі Саюз прасунуў свае граніцы значна на захад.

Выключна вялікае значэнне маюць дагаворы аб узаемадапамозе паміж СССР і прыбалтыйскімі краінамі — Эстоніяй, Латвіяй, Літвой, Фінляндскай Дэмакратычнай Рэспублікай. Гэтыя дагаворы забяспечваюць безапаснасць нашых граніц і яшчэ больш умацоўваюць ваенную магутнасць Совецкага Саюза.

У цяперашні час наша доблесная Чырвоная Армія ў барацьбе з белафінамі забяспечвае абарону горада Ленінграда і ўсёй нашай краіны, ліквідуе адзін з небяспечнейшых ачагоў вайны і дапамагае працоўнаму фінскаму народу вызваліцца ад крывавага іга шайкі англа-французскіх лакеяў — Манергейма-Танера.

Пройдзены пасля XVIII з'езда год быў вельмі паспяховым і ў справе ўздыму марксісцка-ленінскага выхавання кадраў партыі і дзяржавы. Велізарнае значэнне ў гэтым мелі выхад у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» і пастанова ЦК ВКП(б) аб прапагандзе.

Праходзячыя зараз выбары кіруючых партыйных органаў дэманстрыруюць цесную згуртаванасць усіх членаў партыі, усіх партыйных арганізацый вакол ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта, бязмежную іх адданасць справе Леніна—Сталіна і вялікаму правадыру партыі таварышу Сталіну.

Сходы пярвічных партыйных арганізацый, партыйныя канферэнцыі праходзяць дзелавіта, арганізавана, на высокім ідэйным узроўні. На гэтых сходах, канферэнцыях партыя правярае, як яе партыйныя арганізацыі, як кіруючыя партыйныя органы выконваюць гістарычныя рашэнні XVIII з'езда партыі. Партыйныя арганізацыі намячаюць канкрэтныя шляхі яшчэ больш паспяховага выканання рашэнняў з'езда.

XVIII з'езд ВКП(б) адкрыў новую старонку ў гісторыі нашай соцыялістычнай радзімы. Ён узброіў совецкі народ магутнай зброяй барацьбы за комунізм, за паспяховае выкананне трэцяй сталінскай пяцігодкі. Выдатныя поспехі першага года, пройдзенага краінай пасля з'езда, натхняюць совецкі народ на скарэйшае выкананне сусветна-гістарычных задач, пастаўленых з'ездам, на хутчэйшае завяршэнне будаўніцтва комуністычнага грамадства.

Н. МАЦЮШКІН.

ТЭЛЕГРАМЫ

ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ 50-ГОДДЗІ ТАВ. МОЛАТАВА

ЛІТВА

Каунас. 9 сакавіка. (ТАСС). Усе літоўскія газеты публікуюць сёння артыкулы, прысвечаныя пяцідзесяцігоддзю з дня нараджэння таварыша Молатава. Газеты публікуюць на відным месцы партрэт таварыша Молатава і яго біяграфію, а таксама Ўказы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб узнагароджанні тав. Молатава ордэнам Леніна, аб перайменаванні горада Пермі ў горад Молатаў і Пермскай вобласці ў Молатаўскую вобласць і аб устанаўленні 300 стыпендый імені таварыша Молатава для навучаючыхся ў вышэйшых школах.

Газета «Лістувос айдас» у артыкуле, прысвечаным пяцідзесяцігоддзю з дня нараджэння В. М. Молатава, піша:

«Сёння Старшыні Совета Народных Камісараў СССР В. М. Молатаву спаўняецца 50 год. Гэты юбілей урачыста адзначаецца народамі Совецкага Саюза. Молатаў у многіх адносінах з'яўляецца выдаючайся асобай. Ужо 10 год ён узначальвае Совет Народных Камісараў СССР. Гэты чалавек усё сваё свядомае жыццё працаваў разам з партыяй, якой суджана было пасля сусветнай вайны на руінах царскай імперыі стварыць новую дзяржаву».

Газеты «Лістувос айдас», «Лістувос жыніос» «ХХ амжыус» перадрукавалі артыкул «Праўды», прысвечаны пяцідзесяцігоддзю з дня нараджэння таварыша Молатава.

ЛАТВІЯ

Рыга. 9 сакавіка. (ТАСС). Сёння ўвесь латвійскі друк адзначае пяцідзесяцігоддзе з дня нараджэння таварыша Молатава. Ва ўсіх газетах апублікаваны партрэты таварыша Молатава і яго біяграфіі. Газеты паведамляюць таксама аб узнагароджанні таварыша Молатава ордэнам Леніна і аб шматлікіх мітынгах у СССР, прысвечаных пяцідзесяцігоддзю таварыша Молатава.

ГЕРМАНІЯ

Берлін. 9 сакавіка. (ТАСС). Усе газеты адзначаюць пяцідзесяцігадовы юбілей таварыша Молатава.

Газета «Фелькішэр беобахтэр» у нумары ад 9 сакавіка апублікавала артыкул пад загалоўкам «Молатаву 50 год».

Газета піша: «Главе Совецкага ўрада і Народнаму Камісару замежных спраў Молатаву сёння спаўняецца 50 год. Яго заслугай, як старшыні Соўнаркома і Народнага Камісара замежных спраў з'яўляецца ўмацаванне ролі Совецкага Саюза ў міжнароднай палітыцы. Толькі дзякуючы ясным і мэтанакіраваным установкам, у якіх Молатаў адлюстраваў ролю Совецкага Саюза ў кругу еўрапейскіх вялікіх дзяржаў, былі паспяхова закончаны пачаўшыяся летам мінулага года германа-совецкія перагаворы».

Абвяржэнне германскага пасольства

Агенцтва Асошыэйтэд Прэс апублікавала паведамленне свайго берлінскага карэспандэнта аб змесце перагавораў паміж Гітлерам і ўпаўнаважаным прэзідэнта США Рузвельта Уэлесам, якія адбыліся 3-га сакавіка ў Берліне. Германскае пасольства ў Маскве паведаміла па гэтаму поваду наступнае:

У сувязі з чуткамі, якія паявіліся ў замежным друку адносна перагавораў спецыяльнага амерыканскага дэлегата Уэлеса ў Берліне, германскія кампетэнтныя органы канстатуюць, што абедзве стораны строга і лаяльна выканалі рашэнне не апублікоўваць змест гэтых перагавораў. Такім чынам, змест паведамлення замежнага друку пазбаўлен усякай асновы і з'яўляецца яўнай спробай пасеяць паміж Германіяй і Злучанымі Штатамі Паўночнай Амерыкі недавер'е і ўвесці ў заблуджэнне сусветную грамадскую думку адносна вядомых і ясных мэт вайны Германіі.

ПАЕЗДКА РЫБЕНТРОПА Ў РЫМ

Берлін. 8 сакавіка. Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што 9 сакавіка ў Рым выедзе міністр замежных спраў Германіі Рыбентроп. (ТАСС).

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

Парыж. 9 сакавіка. Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора на заходнім схіле Вогезаў паміж французскімі і германскімі атрадамі адбылася сутычкам, якая закончылася паспяхова для французаў. (ТАСС).

ЯК ПРАХОДЗІЦЬ ПАШПАРТЫЗАЦЫЯ

(Гутарка з начальнікам Беластоцкага абласнога пашпартнага аддзела тав. В. А. Чэснаковым).

Начальнік абласнога пашпартнага аддзела тав. Чэснакоў у гутарцы з супрацоўнікам нашай рэдакцыі паведаміў наступнае:

„З вялікай радасцю сустрэлі працоўныя Беластоцкай вобласці пачаўшуюся з 1 сакавіка кампанію па выдачы совецкіх пашпартаў. Рабочыя фабрык і заводаў Беластока, Гродна, Ломжы і іншых гарадоў прыходзяць ў пашпартныя пункты своечасова з усімі патрэбнымі даведкамі. Бышая палітзняволеная, намеснік старшыні фабкома 1 тэкстыльнага камбіната гор. Беластока, Любоў Якаўлеўна Дэйновіч пры атрыманні пашпарта заявіла:

— Мая мара—быць грамадзянкай вялікага Совецкага Саюза аформлена канчаткова. Аб гэтым на руках я ўжо маю адпаведны дакумент—пашпарт. Буду-ж берагчы яго як самую каштоўную рэч...

Так заяўляюць, так думаюць усе працоўныя нашай вобласці. Інакш і не можа быць, бо яны ведаюць, што народы СССР, Чырвоная Армія, партыя Леніна—Сталіна вызвалілі іх ад капіталістычнай кабалы, прынеслі ім права на працу, права на адпачынак, права на асвету і т. д.

Аднак, у ходзе пашпартызацыі, як паказваюць папярэднія вынікі першай дэкады, маюцца і буйнейшыя недахопы.

Трэба адзначыць, што большасць грамадскіх арганізацый усё яшчэ стаяць у баку ад гэтай важнейшай кампаніі. Зусім дрэнна пастаўлена растлумачальная работа аб значэнні пашпартызацыі. Некаторыя гаспадарчыя арганізацыі тармозяць нам у рабоце. Так начальнік Беластоцкага чыгуначнага дэпо тав. Дзядко адмовіўся прадставіць памяшканне для пашпартнага пункта, а асобныя кіраўнікі ўстаноў часта адмаўляюць рабочым у выдачы даведак для прадстаўлення ў пашпартныя пункты.

Недапушчальную бестурботнасць і непаваротлівасць праяўляе дзяржаўная фатаграфія (дырэктар тав. Рышын) Выраб фотаздымкаў, як правіла, затрымліваецца на 3 — 4 дні больш устаноўленага тэрміну. Заўважаецца блытаніна ў здымках і т. д.

Работнікам пашпартных пунктаў пры дапамозе партыйных, комсамольскіх, профсаюзных і гаспадарчых арганізацый неабходна ў самыя бліжэйшыя дні поўнасцю ліквідаваць выяўленыя недахопы.

Для таго, каб у свой час і без лішніх турбот атрымаць пашпарт, кожны грамадзянін павінен з'явіцца ў пашпартны пункт адпаведнага ўчастка ў тэрмін, апавешчаны ўпаўнаважанымі па ўчастку. Атрымальнік пашпарта пры сабе павінен мець стандартную даведку з месца жыхарства, метрычны выпіс, альбо другі дакумент, паказваючы год нараджэння, вайсковы білет (для ваенна-абавязанных) даведку з месца работы (для працуючых) і два фотаздымкі.

Усе грамадзяне павінны ведаць значэнне совецкага пашпарта. Кожнаму грамадзяніну неабходна памятаць, што совецкі пашпарт з'яўляецца адзіным дакументам, які сведчыць аб асобе совецкага грамадзяніна. Пашпарт трэба сцерагчы, як самы цэнны дакумент. Так ставіцца пытанне аб пашпарце і нашымі совецкімі законамі. Кожны, хто згубіць наш пашпарт, будзе плаціць 100 рублёў штрафу. Неатрымаўшыя пашпартаў не будуць прапісаны і не змогуць пражываць у Беластоку ці ў іншым населеным пункце нашай вобласці.

Выдачу пашпартаў новым совецкім грамадзянам мы павінны правесці і правядзем у тэрмін і ўзорна!"

АБЛАСНАЯ НАРАДА МЕДЫЦЫНСКІХ РАБОТНІКАЎ

Сёння ў Беластоку адкрываецца першая абласная нарада работнікаў аховы здароўя, якая падвядзе вынікі больш чым пяцімесячнай работы і наменціць шляхі далейшага развіцця і паляпшэння лячэбнай і санітарна-прафілактычнай работы ў вобласці.

За параўнаўча кароткі перыяд у вобласці значна расшырана сетка бальніц, радзільных дамоў, паліклінік, дыспансераў, кансультацый, санітарна-прафілактычных устаноў і дзіцячых ясляў. Да прыходу Чырвонай Арміі тут было 26 бальніц, а на першае сакавіка — 41. Лік ложкаў павялічыўся больш чым удвая. Лік дзіцячых і жаночых кансультацый павялічыўся з 6 да 19, уноў адкрыты 17 акушэрскіх пунктаў, 7 санітарных пунктаў, 4 венерычных пункты, 2 туберкулёзных, 1 трахомны і г. д.

Удзельнікам нарады патрэбна будзе абмеркаваць пытанні максімальнага паляпшэння якасці лячэбнай і прафілактычнай работы. У нас яшчэ многа недахопаў. Галоўны з іх—разрыў у медыцынскім абслугоўванні горада і вёскі. Калі ў гарадскіх лячэбных установах наглядаецца нават лішак урачэбных кадраў, то ў некаторых раёнах усю лячэбную работу праводзяць толькі фельчары. Асабліва многа недаходаў у аказанні ўнебальнічай дапамогі.

Няма сумнення, што на нарадзе будуць унесены прапановы па падняццю медыцынскага абслугоўвання ў вобласці.

С. М. Лебедзеў,
С. Л. Рапапорт.

У дзіцячых яслах у г. Беластоку. (Фота-клішэ ТАСС).

ПА ГОРАДУ І ВОБЛАСЦІ

КІНОТЭАТР ДЛЯ НАВІНАК

З 12 сакавіка гарадскі кінотэатр «Родина» пачынае дэманстраваць кароткаметражныя фільмы. Тут глядач зможа ўбачыць малюнкі з жыцця і быту совецкага народа, кіножурналы, хранікальна - дакументальныя і навуковыя фільмы, дасягненні навукі, тэхнікі і г. д.

БЮРО НАДВОР'Я Ў БЕЛАСТОКУ

У бліжэйшыя дні ў Беластоку пачне працаваць бюро надвор'я, якое будзе з'яўляцца філіялам Беларускага ўпраўлення гідраметэаралагічнай службы. Бюро будзе абслугоўваць народную гаспадарку заходніх абласцей БССР і грамадзянскі паветраны флот.

Зараз ідзе падрыхтоўка кадраў для работы на перыферыі. 30 чалавек скончылі ўжо трохмесячныя падрыхтоўчыя курсы. З 15 сакавіка пачынаецца яшчэ адзін падрыхтоўчы курс таксама на 30 чалавек.

МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА БАРАЦЬБЕ З ТРАХОМАЙ

Для правядзення паспяховай барацьбы з захворваннямі трахомай у Беластоцкай вобласці праводзіцца рад мерапрыемстваў.

У Беластоку адкрыўся вочны стацыянар на 30 ложкаў. Такі-ж стацыянар створан у гор. Гродна. Для перападрыхтоўкі медсясцёр будуць праведзены двухмесячныя курсы.

У Бельску адкрываецца асобны дзіцячы дом для хворых трахомай. У раёны вобласці, найбольш паражоныя трахомай, будуць накіраваны ўрачы - спецыялісты.

На разгортванне работы па барацьбе з трахомай прадугледжваецца выдатак у суме 215 тысяч рублёў.

ЯСЛІ НА 5 КАМБІНАЦЕ

На вуліцы Парковай, каля самага лесу, у сонечных утульных пакоях адкрыты яслі для дзяцей рабочых 5 тэкстыльнага камбіната.

Дзеці ў яслах чыста апрануты, добра харчуюцца і растуць здаровымі, моцнымі.

НОВЫЯ СОЎГАСЫ Ў БЕЛАСТОЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Расце колькасць соўгасаў у вобласці. Зараз арганізуюцца новыя соўгасы ў былых маёнтках Парыта-Яблынь, Замбраўскага раёна, Грудак, Янкі і Віктожыц, Цеханавецкага раёна.

У гэтых соўгасах будуць створаны базы племяннай жывёлагадоўлі.

КУРСЫ СЯЛЯНСКАГА АКТЫВА

Пры Гродненскім раённым выканаўчым камітэце адкрыты курсы сялянскага актыва. Займаецца 60 чалавек. Сярод іх члены сялянскіх камітэтаў, члены сельскіх советаў, актывісты вёсак.

На працягу двух тыдняў курсанты будуць вывучаць пытанні агратэхнікі, жывёлагадоўлі, рашэнні партыі і ўрада аб сельскай гаспадарцы. Акрамя таго на курсах будзе вывучацца даклад таварыша Сталіна на XVIII з'ездзе партыі і трэці пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі.

БАЛЬНІЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА

У 1940 годзе ў гор. Гродна будзе закончана будаўніцтва радзільнага аддзялення гарадской бальніцы.

Новае аддзяленне разлічана на 60 ложкаў.

На будаўніцтва адпушчана 650 тысяч рублёў.

ПАВЕДАМЛЕННІ

11-га сакавіка ў 8-й гадзін вечара (па маскоўскаму часу) у Доме Чырвонай Арміі адбудзецца інструктыўны даклад для дакладчыкаў і агітатараў горада на тэму: «69 гадавіна Парыжскай комуны».

Запрашаюцца агітатары выбарчых участкаў.

Гарком КП(б)Б.

* * *

11 сакавіка 1940 г. у 20 гадзін (па маск. часу) у Доме партыйнай асветы (Талстога, № 9) адбудзецца лекцыя для агітатараў і бяседчыкаў на тэму:

«Сталінская Канстытуцыя — самая дэмакратычная канстытуцыя ў свеце».

Лектар тав. Якімовіч.

Дом партасветы.

* * *

10 сакавіка ў Доме партасветы (вул. Талстога, 9) адбудзецца

ЛІТАРАТУРНЫ ВЕЧАР,

прысвечаны выбарам у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, з удзелам пісьменнікаў гор. Мінска.

У праграме вечара:

1. Даклад аб беларускай совецкай літаратуры пісьменніка **В. Вольскага.**
2. Выступленні с чыткай твораў паэта - ордэнаносца **Пятро Глебка,** пісьменнікаў: **А. Якімовіча, Я. Бранеўскай, Е. Сельм** і паэтаў **Ф. Пестрака, П. Панчанка, Х. Фукса, І. Рубінштэйна, М. Кнапгайса, С. Бурштэйна.**

Пачатак у 8 гадзін вечара.

Саюз Совецкіх Пісьменнікаў БССР.

Адказны рэдактар **Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.**

На аснове ўказання НКФ БССР і пастаноў аблвыканкома ад 6-га сакавіка 1940 г. у гарадах і населішчах гарадскога тыпу з 10 па 25 сакавіка 1940 г. па ўсёй Беластоцкай вобласці будзе праводзіцца падатковы ўчот маючых самастойныя крыніцы даходу ад занятку гандлем, прамысловай дзейнасці, саматужна-рамесніцкіх промыслаў, работы не па найму, а таксама ад зямельных участкаў, пабудоў, рабочай і буйнай прадукцыйнай жывёлы, здачы ў наём памяшканняў і г. д.

Асобы, пражываючыя ў сельскай мясцовасці і не маючыя ніякіх даходаў, апрача даходаў ад сельскай гаспадаркі, гэтаму падатковаму ўчоту не падлагаюць.

Пражываючыя ў сельскай мясцовасці і, побач з заняткам сельскай гаспадаркай, маючыя даходы ад заняткаў гандлем, прамысловай дзейнасцю, саматужна-рамесніцкімі промысламі з прымяненнем наёмнай працы, падлягаюць падатковаму ўчоту на агульных асновах.

Кіраўнікі дамоў і прыватныя домаўласнікі абавязаны атрымаць у горрайфінаддзелах ці пунктах картачкі падатковага ўчоту для запаўнення і здачы ва ўстаноўлены тэрмін календарнымі планамі ці пастановамі горрайвыканкому ў прыёмныя пункты.

За несвоечасовую яўку за атрыманнем, няправільнае запаўненне, падачу няправільных звестак, непрадастаўленне ў тэрмін і ўхіленне ад падачы картачак падатковага ўчоту віноўныя будуць падвяргацца штрафу да 100 рублёў.

АБЛФІНАДДЗЕЛ.

БЕЛАСТОЦКІ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

аб'яўляе набор слухачоў на 6-месячныя курсы настаўнікаў рускай і беларускай мовы і літаратуры для выкладання ў 8—10 класах сярэдняй школы.

На курсы прымаюцца асобы, маючыя вышэйшую і незакончаную вышэйшую асвету.

Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй і кватэрнымі.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі Педінстытута штодзённа з 10 да 15 гадзін 30 мінут дня па 15 сакавіка 1940 года.

Заняткі пачнуцца 15 сакавіка 1940 г.

Педагагічны інстытут.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны аблліта № 308.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.